# Працаваць на перспектыву

## Як дзяржаўныя льготы і прэферэнцыі спрыяюць развіццю паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці

**У чэрвені мінулага года Прэзідэнт краіны А. Лукашэнка падпісаў Указ № 235 «Аб сацыяльна-эканамічным развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці». Гэты дакумент заклікаreceived ўзняць на значна больш высокую ступень вытворчы, эканамічны і сацыяльны патэнцыял шэрага рэгіёнаў Магілёўшчыны. Што адбываецца на практыцы, як выконваюцца палажэнні ўказа кіраўніка дзяржавы?**

Пазначаны прэзідэнцкім указам паўднёва-ўсходні рэгіён Магілёўскай вобласці ўключае ў сябе сем раёнаў: Касцюковіцкі, Клімавіцкі, Краснапольскі, Крычаўскі, Слаўгарадскі, Чэрыкаўскі і Хоцімскі. Знайсці яго на карце Беларусі вельмі проста – гэта самая ўсходняя тэрыторыя нашай краіны, якая невялікім выступам мяжуе з Расійскай Федэрацыяй. Так склалася, што ў перыяд халоднай вайны гэты рэгіён увайшоў у зону стратэгічных інтарэсаў Масквы, тады яшчэ агульнасаюзнай сталіцы. Ствараючы вакол яе надзейны паветраны шчыт, савецкае вайеннае кіраўніцтва ўключыла ў адну з яго абарончых ліній і паўднёва-ўсходнюю частку беларускай Магілёўшчыны. Натуральна, што пасля гэтага тут з'явілася некалькі авіяцыйных і ракетных вайсковых падраздзяленняў. Праўда, адначасова, ужо грамадзянскімі саюзнымі ведамствамі, было прынята рашэнне і аб удасканаленні мясцовай сацыяльна-эканамічнай сферы. У выніку – у буйных гарадах былі пабудаваны прадпрыемствы з так званым саюзным статусам, і гэта дало дадатковы штуршок для развіцця ўсяго рэгіёна.

Аднак дынаміка перамен да лепшага была парушана ў канцы красавіка 1986 года. Пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС нябачныя радыеактыўныя хмары аселі на асобных тэрыторыях гэтага рэгіёна, пасля чаго ўлады мусілі прыняць меры па адсяленні жыхароў з тых населеных пунктаў, дзе назіраўся найбольшы радыяцыйны фон. А ў пачатку 1990-х гадоў тут надарыўся яшчэ адзін крызіс. На гэты раз ён быў звязаны з распадам Савецкага Саюза, вынікам чаго стаў вывад на тэрыторыю ўжо суверэннай Расіі большасці вайсковых часцей і стратай прадпрыемствамі саюзнага значэння спрыяльнага для іх дзейнасці статусу. Пасля гэтага пастýпальнае развіццё сацыяльна-эканамічнай сферы паўднёва-ўсходніх тэрыторый Магілёўшчыны замарудзілася. Больш таго, з часам яно стала прыкметна адставаць ад тых станоўчых перамен, што адбываліся ў іншых рэгіёнах вобласці і краіны.




▼ Паўднёва-ўсходні рэгіён на карце-схеме Магілёўскай вобласці

Гэты рэгіянальны дыспарытэт не застаўся без увагі кіраўніцтва краіны. Прынамсі, Прэзідэнт А. Лукашэнка падчас сваіх традыцыйных штогадовых паездак па пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС беларускіх тэрыторыях некалькі разоў наведваў гэтыя мясціны, знаёміўся з іх сацыяльна-эканамічным станам. Пасля кожнай з такіх паездак кіраўніком дзяржавы даваліся канкрэтныя даручэнні ўладам Магілёўскай вобласці, ураду па выпраўленні становішча. І, трэба зазначыць, пэўныя захады ў гэтым напрамку праводзіліся. Аднак не ўсе і не ў поўнай меры.

На нарадзе ў Клімавічах у красавіку 2014 года Прэзідэнт краіны зазначыў: «Я папрасіў аблвыканкам, памочнікаў і ўрад падумаць аб тым, што трэба зрабіць, каб жыццё тут нічым не адрознівалася ад таго, што ў Горках, Шклове, на поўначы Магілёўскай вобласці». Ён нагадаў, што ў аблвыканкаме з такім падыходам згаджаліся, ківалі галовамі, маўляў, распрацуем праграмы і будзем выконваць: «Аднак, здаецца, за словамі эфектыўных крокаў не было зроблена. Рэгіён як быў у адстаючых, так і прадаўжае быць у хвасце. Хоць фінансавых сродкаў і іншых рэсурсаў за гэтыя гады было патрачана нямала – і на мадэрнізацыю прадпрыемстваў, і на дэзактывацыю зямель, і на іншыя мерапрыемствы. Мы пайшлі на тое, што пачынаючы з 2010 года грошы на фінансаванне чарнобыльскіх праграм перадаваліся з рэспубліканскага бюджэту ў вобласці. На месцах, маўляў, лепш відаць, як больш эфектыўна іх выкарыстоўваць». Толькі ў 2013 годзе ў рамках адной Дзяржаўнай праграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на 2011–2015 гады і на перыяд да 2020 года ў паўднёва-ўсходні рэгіён Магілёўшчыны ў выглядзе субвенцый з рэспубліканскага бюджэту было накіравана амаль 400 млрд недэнамінаваных рублёў, але, на думку Прэзідэнта, яны не знялі з парадку дня пытанне аб неабходнасці больш інтэнсіўнага развіцця сацыяльна-эканамічнай інфраструктуры гэтай тэрыторыі.

На той жа нарадзе ў Клімавічах кіраўніком дзяржавы было дадзена даручэнне кіраўніцтву Магілёўскай вобласці і ўраду краіны распрацаваць асобны дакумент, які б лёг у аснову канцэпцыі стабільнага і эканамічна канкурэнтаздольнага развіцця згаданага рэгіёна. Так з'явіўся Указ № 235 «Аб сацыяльна-эканамічным развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці».

– Гэты дакумент прыняты ў мэтах устойлівага развіцця сямі раёнаў нашай вобласці, што адносяцца да паўднёва-ўсходняга рэгіёна, – расказвае першы намеснік старшыні камітэта эканомікі Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір Мураўёў. – Ён прадугледжвае для гэтага стварэнне як усіх неабходных умоў, так і некаторых прэферэнцый. Прынамсі, для фізічных асоб прадастаўляецца 3-працэнтная льгота па выплаце падаходнага падатку з даходаў у выглядзе аплаты працы, атрыманых па працоўных дагаворах ці кантрактах ад арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія зарэгістраваны на тэрыторыі паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці і займаюцца тут вытворчасцю тавараў, выкананнем работ, аказаннем паслуг на працягу апошніх 7 гадоў. Для наймальнікаў і камерцыйных арганізацый, якія зарэгістраваны і ажыццяўляюць зноў жа на працягу апошніх 7 гадоў сваю дзейнасць у згаданым рэгіёне, прадугледжаны льготы па абавязковых страхавых узносах па страхаванні выпадкаў дасягнення пенсійнага ўзросту, інваліднасці і страты карміцеля (пенсійнае страхаванне) у бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва ў памеры 11 %. І яшчэ адна вельмі важная пазіцыя прэзідэнцкага ўказа: грамадзяне Беларусі, якія будуць будаваць або набываць жылыя памяшканні ў населеных пунктах паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці, змогуць атрымліваць на гэта льготныя крэдыты пад 1 % гадавых тэрмінам да 20 гадоў. Праўда, пры гэтым ім неабходна выканаць адну ўмову – не менш як 10 гадоў з моманту атрымання такіх крэдытаў ажыццяўляць сваю працоўную дзейнасць на тэрыторыі рэгіёна. Прадугледжана таксама фінансаванне расходаў па стварэнні інжынернай і транспартнай інфраструктуры, неабходнай для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў з заяўленым аб'ёмам інвестыцый, што не перавышаюць 10 млн еўра, у памеры 50 % за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, а пры суме інвестыцый больш за 10 млн еўра – 100-працэнтным прыцягненні рэспубліканскіх бюджэтных сродкаў. Тэрмін жа дзеяння гэтага ўказа распаўсюджваецца больш як на 5 гадоў – ад 1 ліпеня 2015 года,



▲ 60 сем'яў у Клімавічах справілі наваселле ў доме, пабудаваным на льготных умовах, гарантаваных указам Прэзідэнта № 235

з часу свайго афіцыйнага ўступлення ў сілу, да 31 снежня 2020 года.

Акрамя гэтага, у працяг выканання даручэнняў Прэзідэнта краіны была распрацавана і зацверджана Магілёўскім абласным Саветам дэпутатаў Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці на перыяд да 2020 года. Яе з'яўленне абумоўлена неабходнасцю забеспячэння ўстойлівага эканамічнага росту і эфектыўнага сацыяльнага развіцця згаданага рэгіёна з улікам найбольш рацыянальнага выкарыстання працоўнага патэнцыялу і мясцовых прыродна-сыравінных рэсурсаў. Гэты дакумент вызначае мэты, задачы, індыкатары і прыярытэтныя напрамкі развіцця паўднёвага ўсходу нашай вобласці, прапануе комплекс мер і мерапрыемстваў па павышэнні ўзроўню жыцця насельніцтва, мадэрнізацыі ўжо існуючых вытворчасцей, як і па стварэнні новых…

Прэзідэнцкі ўказ № 235 дзейнічае ўжо амаль паўтара года. І, як расказвае далей Уладзімір Іванавіч, выкананне яго палажэнняў прынесла пэўныя зрухі ў агульным сацыяльна-эканамічным становішчы паўднёва-ўсходняй Магілёўшчыны, а таксама ў забеспячэнні насельніцтва жыллём. У прыватнасці, будаўніцтва жылля на ўмовах дзяржзаказу вядзецца ў кожным з сямі раёнаў паўднёвага ўсходу вобласці: 40-кватэрныя жылыя дамы ўзводзяцца ў Краснаполлі, Хоцімску і Чэрыкаве, 20-кватэрны – у Крычаве, 60-кватэрныя – у Касцюковічах і Слаўгарадзе. А адносна нядаўна, у жніўні месяцы, уваходзіны справілі навасёлы такога ж шматкватэрнага дома ў Клімавічах.

Ёсць свае напрацоўкі і ў эканамічнай сферы. Так, за час дзеяння згаданага дакумента ў гэтым рэгіёне была створана 61 новая камерцыйная арганізацыя, у тым ліку – 33 за тры кварталы бягучага года. Найбольшая іх колькасць у перыяд ад 1 ліпеня 2015 года да 1 кастрычніка 2016 года была зарэгістравана ў Крычаўскім раёне – 18. У Клімавіцкім раёне з'явілася 10 новых камерцыйных арганізацый, у Хоцімскім і Слаўгарадскім – адпаведна 9 і 8, па 5 новых суб'ектаў гаспадарання было створана ў Касцюковіцкім і Чэрыкаўскім раёнах і на адзін больш – на Краснапольшчыне. Увогуле ж па стану на 1 кастрычніка гэтага года ў паўднёва-ўсходнім рэгіёне налічвалася 413 камерцыйных арганізацый.

Апошнім часам значна актывізавалася тут і інвестыцыйная дзейнасць. На прадастаўленыя ўказам прэферэнцыі і спрыяльныя ўмовы, якія ствараюцца для вядзення бізнесу на месцах, сталі больш звяртаць увагі не толькі айчынныя, але і замежныя інвестары. Так, у Касцюковіцкім раёне нямецкая кампанія «Інтэррыджынал Энерджы Кампані ГмбХ» ажыццяўляе будаўніцтва трох фотаэлектрычных станцый агульнай магутнасцю 4,5 МВт для вытворчасці электраэнергіі з аднаўляльных крыніц – энергіі сонца. Дарэчы, першая з іх магутнасцю 1,5 МВт ужо здадзена ў эксплуатацыю сёлета ў жніўні. Яшчэ дзве станцыі пачнуць працаваць у будучым годзе. Таксама ў 2017 годзе нямецкія спецыялісты пабудуюць яшчэ адзін аб'ект – біягазавы комплекс для вытворчасці электрычнай і цеплавой энергіі магутнасцю да 1 МВт у вёсцы Нізкі. У цэлым затраты інвестара на рэалізацыю двух гэтых праектаў складуць каля 4 млн еўра.

У Краснапольскім раёне асаблівыя надзеі на рэалізацыю палажэнняў указа № 235 ускладае мясцовы жылкамунгас. На прадпрыемстве будуць выбраляць пенаблокі не толькі для сваіх патрэб, але і на продаж. Аднachасова палітыка камунальнікаў накіравана на мадэрнізацыю і ўдасканаленне форм працы. На балансе жылкамгаса знаходзіцца жыллёвы фонд раёна, сетка комплексных прыёмных пунктаў, кацельні ў гарадскім пасёлку Краснаполле і ў некалькіх сельскіх населеных пунктах. І трэба, каб усё гэта эфектыўна функцыянавала. Таму прэферэнцыі, дадзеныя прэзідэнцкім указам, тут вельмі дарэчы. На іх таксама разлічваюць і ў мясцовым лясгасе, на базе якога заплана-

Беларуская Думка

вана рэалізацыя інвестыцыйнага праекта па мадэрнізацыі дрэваперапрацоўчага цэха ў вёсцы Кажамякіна. Летась там была запушчана новая лінія па перапрацоўцы драўніны, што паспрыяла як пашырэнню магутнасці вытворчасці, так і з'яўленню 10 новых працоўных месцаў. Адначасова вырас і экспарт – цяпер краснапольскія лесагаспадарнікі пастаўляюць сваю прадукцыю па доўгатэрміновых кантрактах у Германію, Бельгію, Эстонію і Латвію. Аднак на дасягнутым тут спыняцца не плануюць. Будаўніцтва сушыльнай гаспадаркі ў дрэваапрацоўчым цэху дасць магчымасць атрымліваць прадукцыю з павялічанай дабаўленай вартасцю. Ужо праведзены тэндары на права пастаўкі абсталявання, яго ўстаноўкі і наладкі.

Акрамя гэтага, прыярытэтнымі напрамкамі для інвестыцый на Краснапольшчыне з'яўляюцца вытворчасць цэглы, разліў пітной і мінеральнай вады, развіццё альтэрнатыўнай энергетыкі, перапрацоўка другаснай сыравіны. У раёне таксама зацікаўлены ў адкрыцці прадпрыемства па аказанні транспартна-лагістычных паслуг, развіцці прыдарожнага сэрвісу і сэрвіснага абслугоўвання аўтамабіляў, выпуску тавараў лёгкай прамысловасці, вырабу паліўных гранул з саломы. Для рэалізацыі гэтых праектаў падрыхтавана 15 інвестыцыйных пляцовак.

Як адзначае У. Мураўёў, асаблівы інвестыцыйны патэнцыял мае і Слаўгарадскі раён. І найперш тут зацікаўлены ў развіцці турыстычнай інфраструктуры. Пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС больш за 30 % тэрыторыі гэтага раёна было выведзена з абароту, у выніку чаго знікла 25 населеных пунктаў. Тым не менш гэты край па-ранейшаму вабіць да сябе турыстаў. І ўсё дзякуючы «Блакітнай крыніцы» – помніку прыроды рэспубліканскага значэння. Людзі не перастаюць верыць у гаючую моц жывой вады. І на тое ёсць падставы: чысцюткая вада тут струменіць з 200-метровай глыбіні агульным аб'ёмам амаль 60 літраў у секунду, пры гэтым яна ўтварае вельмі прыгожае невялікае азярцо ярка-бірузовага колеру…

Яшчэ адзін інвестыцыйны крок быў тут зроблены ў жніўні бягучага года. З мэтай прыцягнення прамых замежных інвестыцый і стварэння новых працоўных месцаў на аўкцыёне быў прададзены будынак прызнанага банкротам унітарнага камунальнага прадпрыемства «Бытпаслугі». Плануецца, што ў бліжэйшы час у ім размесціцца сучасны аб'ект грамадскага харчавання прыватнага прадпрыемства «Наватэль» – пераможцы згаданага конкурсу. Увогуле ж на Слаўгарадчыне ўсебакова падтрымліваецца прыватная ініцыятыва. У раёне паспяхова працуюць 15 сыравараў, некалькі фермерскіх гаспадарак. Тут, разам з развіццём турыстычнага бізнесу, зацікаўлены ў арганізацыі вытворчасці будаўнічых матэрыялаў, удасканаленні гасцінічнай сферы і г.д. Для рэалізацыі гэтых праектаў у раёне створана 11 інвестпляцовак, ёсць 9 прапаноў для інвестыцыйнага супрацоўніцтва.

Свой інвестыцыйны трэнд маецца і на Хоцімшчыне, самым усходнім рэгіёне нашай Беларусі. Гэта – агратурызм, для якога тут створаны надзвычай спрыяльныя ўмовы. Не менш перспектыўнымі з'яўляюцца сельская гаспадарка і прамысловасць. Адна з мінскіх фірм, напрыклад, зацікавілася трэпелам – танкапорыстай асадкавай пародай, утворанай мільёны гадоў таму. На гэта іх падштурхнулі як багатыя такім рэчывам радовішчы, так і прэферэнцыі, якія гарантуе прэзідэнцкі ўказ № 235. Пакуль, праўда, прадпрыемства прайшло толькі стадыю рэгістрацыі, але ў планах сталічных прадпрымальнікаў наладзіць вытворчасць па абагачэнні трэпелам угнаенняў.

З пачатку гэтага года ў Хоцімску на базе мясцовага ўнітарнага камунальнага прадпрыемства «Жылкамгас» рэалізуецца праект на суму больш за 600 тыс. еўра міжнароднай тэхнічнай дапамогі па раздзельным зборы адходаў і іх утылізацыі. За кошт ПРААНаўскіх сродкаў закуплены 180 кантэйнераў для раздзельнага збору смецця, два спецаўтамабілі для транспарціроўкі сабраных цвёрдых бытавых адходаў, пагрузчык і прэс. Дзякуючы гэтаму, хоцімцы не толькі атрымалі магчымасць для раздзельнага збору смецця, але і новыя працоўныя месцы. А яшчэ хоцімскія ўлады зацікаўлены ў развіцці ў сваім рэгіёне прыдарожнага сэрвісу, распрацоўцы прызначаных для гаспадарчых патрэб багатых адкладаў сапрапелю. У дадатак да гэтага ў раёне сфарміраваны яшчэ 3 дзейныя інвестыцыйныя пляцоўкі і 13 перспектыўных.

Негалосны лідар інвестыцыйнай палітыкі ў паўднёва-ўсходнім рэгіёне Магілёўскай

вобласці – Клімавіцкі раён. На сучасны момант тут налічваецца 85 камерцыйных прадпрыемстваў і каля 500 індывідуальных прадпрымальнікаў. І іх уклад у эканоміку раёна даволі істотны. Толькі за першае паўгоддзе 2016 года яны адправілі на экспарт прадукцыі на 500 тыс. долараў. Напрыклад, прыватнае прадпрыемства «Оникс», якое займаецца дрэваапрацоўкай, сёлета ў 6 разоў павялічыла свае экспартныя пастаўкі адносна мінулагодніх. Яго прадукцыя карыстаецца попытам у Бельгіі, Галандыі, Германіі, Румыніі і інш. Цяпер на прадпрыемстве працуюць 22 чалавекі, але хутка з'явяцца 7 новых працоўных месцаў. Запланавана мадэрнізацыя вытворчасці, і найперш укараненне энергазберагальных тэхналогій. На набыццё ветрагенератарнай установкі і комплексу сонечных батарэй мяркуюць выдаткаваць каля 30 тыс. еўра.

Ёсць у клімаўчан і добрыя перспектывы. Так, у маі бягучага года было зарэгістравана таварыства з абмежаванай адказнасцю «Буйваліца». Гэта наогул новае для рэгіёна прадпрыемства плануе займацца нехарактэрнай для тамтэйшых мясцін сельскагаспадарчай вытворчасцю – развядзеннем буйваліц з мэтай перапрацоўкі іх малака і пастаўкі гатовай прадукцыі ва ўласныя гандлёвыя кропкі ў Маскве. Расійскі інвестар, які ўзяўся за гэтую справу, адначасова з узвядзеннем фермаў плануе пабудаваць і сучасны малакаперапрацоўчы камбінат, дзе будзе наладжана вытворчасць тварагу і сыроў з малака буйваліц, уключаючы такі гатунак, як мацарэла. Гэты інвестпраект ацэньваецца ў больш як 40 млн еўра. Таксама вялікія надзеі ўскладаюць на Клімавіччыне і на развіццё яшчэ аднаго прыватнага прадпрыемства, якое зоймецца вырабам сухіх будаўнічых сумесяў для пастаўкі іх на рынак Казахстана. У праект плануецца інвесціраваць каля 50 млн еўра. У далейшым гэтыя ж заснавальнікі збіраюцца пабудаваць у раёне яшчэ і завод па вытворчасці газасілікатных блокаў.

▼ **Новая модульная кацельня на ААТ «Клімавіцкі камбінат хлебапрадуктаў»**




Візітнай карткай Клімавічаў з'яўляюцца два буйныя прадпрыемствы – лікёрагарэлачны завод і камбінат хлебапрадуктаў. Іх кіраўніцтва шмат увагі ўдзяляе мадэрнізацыі вытворчых магутнасцей, і гэта дае магчымасць карыстацца прэферэнцыямі. На ААТ «Клімавіцкі лікёра-гарэлачны завод», напрыклад, была праведзена глабальная аўтаматызацыя спіртавой вытворчасці, што станоўча адбілася на якасці прадукцыі і ў пэўнай ступені павысіла экспартны патэнцыял. Лікёра-гарэлачныя вырабы з Клімавічаў можна сустрэць на паліцах магазінаў і ў Расіі, і ў некаторых еўрапейскіх краінах.

ААТ «Клімавіцкі камбінат хлебапрадуктаў» – буйнейшае ў краіне прадпрыемства сваёй галіны. Яго будавалі ў канцы 1980-х гадоў з арыентацыяй на саюзны рынак збыту прадукцыі. Пасля развалу СССР, нягледзячы на сур'ёзную канкурэнцыю з боку аднатыпных беларускіх вытворцаў, клімавіцкае прадпрыемства здолела адстаяць сваю нішу на ўнутраным рынку. Сёння асноўнымі відамі яго вытворчасці з'яўляюцца шырокі спектр камбікармоў для жывёлагадоўчай і птушкаводчай галін, а таксама пшанічная і жытнёвая мука, манныя крупы. Выпускае ААТ «Клімавіцкі камбінат хлебапрадуктаў» і эксклюзіўную навінку – зародкавыя пшанічныя шматкі. На прадпрыемстве ўстаноўлена лінія па вытворчасці рапсавага алею магутнасцю да 14 т у суткі. Частка яго выкарыстоўваецца пры прыгатаванні камбікармоў, а астатняе, як і некаторыя іншыя віды прадукцыі, экспартуецца ў Грузію, Латвію, Літву, Польшчу, Расію, Украіну і нават у далёкую Гвінею.

Безумоўна, каб выпускаць канкурэнтназдольны тавар, прадпрыемства мусіць сур'ёзна займацца мадэрнізацыяй свайго вытворчага патэнцыялу, скарачаць затраты і паляпшаць якасць. І гэты працэс тут не спыняецца. Прычым асаблівая ўвага надаецца энергазберагальным тэхналогіям. Так, у першым квартале 2016 года на камбікормавым заводзе была ўведзена ў эксплуатацыю модульная кацельня пара-

вытворчасцю 3 т/гадз. Эканамічны эфект, як мяркуецца, за гэты год складзе каля 2,3 млрд недэнамінаваных рублёў. У дадатак ААТ «Клімавіцкі камбінат хлебапрадуктаў» будуць прадастаўлены яшчэ і прэферэнцыі ад дзяржавы, прадугледжаныя для вытворцаў паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці Ўказам № 235.

У Чэрыкаўскім раёне асноўны ўхіл у рамках рэалізацыі палажэнняў названага дакумента зрабілі на прыцягненні інвестыцый у сферу энергазберажэння. Тут узводзіцца станцыя па вытворчасці электрычнасці магутнасцю 109 МВт. ТАА «Салар Лэнд» ужо выдаткавала на будаўніцтва каля 150 тыс. долараў. А вось ТАА «Энергія Ра» плануе выдаткаваць каля 40 млн долараў на стварэнне ўстановак па выкарыстанні аднаўляльных крыніц энергіі – ветракоў і сонечных батарэй. Пасля поўнага ўводу ў эксплуатацыю абсталявання тут з'явіцца не менш як 20 новых працоўных месцаў.

Спаўна ўжо карыстаецца льготамі і прэферэнцыямі, прадугледжанымі Ўказам № 235, Чэрыкаўскі жылкамунгас. Прадпрыемства атрымала такую магчымасць дзякуючы новаму для сябе віду вытворчай дзейнасці. Тут пачалі выпускаць вокны з профілю ПВХ. Летась чэрыкаўскія камунальнікі ўклалі ў рэалізацыю свайго праекта 450 млн недэнамінаваных рублёў – зрабілі рамонт памяшкання, набылі неабходнае абсталяванне. Што ж да самой прадукцыі, то яна запатрабавана на будаўніцтве і пры капітальным рамонце дамоў. Прынамсі, у 40-кватэрным жылым доме, які плануецца здаць у эксплуатацыю ў Чэрыкаве сёлета, устаноўлены вокны, вырабленыя майстрамі мясцовага жылкамунгаса.

Таксама на базе Чэрыкаўскага жылкамунгаса рэалізуецца яшчэ адзін важны для раёна праект – па замяшчэнні імпартнага прыроднага газу драўнянай біямасай. Цэнтральная кацельня райцэнтра мадэрнізавана пры падтрымцы Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця, а агульны кошт праекта складае больш за 3,3 млн долараў. Між іншым, палівам кацельню забяспечвае мясцовы лясгас, які таксама мае некалькі прыярытэтных напрамкаў дзейнасці. Адзін з іх звязаны з узнаўленнем лясных угоддзяў. Летась тут пасадзілі лесу на плошчы звыш 550 га, сёлета плануецца прыкладна столькі ж. Характэрна, што больш як палова высаджаных маладых дрэўцаў мае палепшаныя селекцыйныя якасці. Усё гэта дзякуючы дзейнасці ляснога гадавальніка. Дарэчы, аднаго з лепшых у краіне паводле крытэрыяў Міністэрства лясной гаспадаркі. Наогул жа ў гадавальніку Чэрыкаўскага лясгаса штогод вырошчваецца каля 11 млн штук пасадачнага матэрыялу больш як 40 відаў драўнянахмызняковых і дэкаратыўных парод.



▲ У цэху па вытворчасці акон Чэрыкаўскага жылкамунгаса

Яскравым прыкладам паспяховага ажыццяўлення Ўказа № 235 у Крычаўскім раёне стала адкрыццё на пачатку верасня гэтага года новага лячэбна-дыягнастычнага корпуса цэнтральнай раённай бальніцы. Увод у эксплуатацыю гэтага аб'екта, аснашчанага сучасным абсталяваннем, якасна пашырыў спектр медыцынскіх паслуг як для жыхароў самой Крычаўшчыны, так і суседніх з ёй раёнаў.

У цэлым жа ў Крычаўскім раёне створаны надзвычай спрыяльны інвестыцыйны

▼ Каля 11 млн штук пасадачнага матэрыялу дрэў і дэкаратыўных кустоў вырошчваецца штогод у гадавальніку Чэрыкаўскага лясгаса





▲У цэху па выпуску цэментна-стружкавых пліт ЗАТ «Белзарубеж-буд» у Крычаве

клімат. Для развіцця сацыяльна-эканамічнага патэнцыялу рэгіёна тут вызначылі 9 асноўных напрамкаў: вытворчасць будаўнічых матэрыялаў, разліў пітной вады, транспарт, лагістыка, сэрвіс, сельскагаспадарчая вытворчасць, грамадскае харчаванне, альтэрнатыўная энергетыка і турызм. Для рэалізацыі мяркуемых праектаў вызначаны больш за 20 інвестыцыйных пляцовак: інфармацыя пра іх змяшчаецца не толькі на сайце Крычаўскага райвыканкама, але і на сайтах мясцовых адміністрацый суседніх рэгіёнаў Расіі.

Вялікую тэарэтычную дапамогу ў арганізацыі на тэрыторыі Крычаўскага раёна новых вытворчасцей і стварэнні дадатковых працоўных месцаў аказвае Цэнтр падтрымкі прадпрымальніцтва, спецыялісты якога па запыту патэнцыяльных інвестараў даюць вычарпальную інфармацыю па кожным цікавым ім канкрэтным праекце, садзейнічаюць у афармленні дакументаў. Акрамя гэтага, думаюць тут і пра выхаванне прадпрымальніцкай жылкі ў моладзі. У раёне рэгулярна праходзяць заняткі ў стартап-школе, дзе разглядаюцца тэмы, звязаныя з развіццём бізнесу і прадпрымальніцтва. Іх ахвотна наведваюць навучэнцы мясцовых школ, ліцэя і каледжа, маладыя работнікі прадпрыемстваў і арганізацый. Асноўная задача – растлумачыць слухачам спецыфіку інвестыцыйных мерапрыемстваў і схемы работы над праектамі, даць тэарэтычную інфармацыю і практычныя навыкі па распрацоўцы бізнес-планаў. І гэтыя намаганні маюць свой плён: моладзь цікавіцца інвестыцыйнай палітыкай свайго рэгіёна, уносіць прапановы па яе ўдасканаленні, выступае ініцыятарам актуальных для мясцовай эканомікі праектаў.

Прыкладаў рэалізацыі інвестыцыйных праектаў, якія ажыццяўляюцца ў рамках выканання палажэнняў указа № 235 ці ініцыююцца, на Крычаўшчыне з добры дзясятак. А найбольш паспяховы з іх – вытворчасць цэментна-стружкавых пліт і элементаў няздымнай апалубкі. Гэту новую для беларускай будаўнічай галіны прадукцыю, і яна ўжо запатрабавана, выпускае ЗАТ «Белзарубежбуд». Разам з тым кампанія пастаўляе яе і на экспарт.

Увогуле ж, дзякуючы рэалізацыі палажэнняў указа № 235, у паўднёва-ўсходнім рэгіёне Магілёўшчыны адзначаецца агульны рост аб'ёмаў прамысловай вытворчасці. Як адзначыў у канцы нашай размовы першы намеснік старшыні камітэта эканомікі Магілёўскага аблвыканкама У. Мураўёў, па выніках работы за 9 месяцаў 2016 года прамысловымі прадпрыемствамі згаданага рэгіёна было выпушчана прадукцыі на суму звыш 323 млн дэнамінаваных рублёў, што склала 106,2 % да аналагічнага мінулагодняга перыяду. А гэта значыць, што рэальнае ўвасабленне палажэнняў указа № 235 дае істотны імпульс для комплекснага развіцця рэгіёна, садзейнічае павышэнню ўзроўню жыцця насельніцтва.

На VIII міжнародным інвестыцыйным форуме «Млын поспеху», што праходзіў у Магілёве 4–5 лістапада гэтага года, быў падпісаны шэраг пратаколаў аб намерах па рэалізацыі інвестыцыйных праектаў, якія будуць ажыццяўляцца пераважна на тэрыторыі паўднёвага ўсходу Магілёўшчыны. Прынамсі, адна з найбуйнейшых насенняводчых кампаній Венгрыі плануе ў бліжэйшай перспектыве заняцца ў гэтым рэгіёне вытворчасцю насення кукурузы, а ўжо непасрэдна на Крычаўшчыне будзе рэалізоўвацца інвестпракт па вытворчасці мяса птушкі. Відавочна, гэта далёка не ўсе здабыткі, скажам так, інвестыцыйнай прыцягальнасці адзначаных вышэй сямі паўднёва-ўсходніх раёнаў Магілёўскай вобласці.

**Сяргей ГАЛОЎКА**
**Фота аўтара**

***Тэма сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна ў святле задач, пастаўленых у ходзе рабочага візіту ў Магілёўскую вобласць Прэзідэнта Беларусі А.Р. Лукашэнкі, будзе прадоўжана ў наступным нумары часопіса.***